Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

28 лютага 2015 года, № 3 (2127)

ПАДЗЕЯ

Дапамагчы чалавеку змяніцца

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Павел напярэдадні Даравальнай нядзелі сустрэўся з выкладчыкамі і студэнтамі факультэта міжнародных адносін.

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Размову распачаў рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, які прадставіў Уладыку аўдыторыі і распавёў пра яго багатую біяграфію. Мітрапаліт скончыў Маскоўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя, затым быў накіраваны ў рускую духоўную місію ў Іерусаліме. У 1982 г. ён стаў намеснікам главы місіі. З 1986 г. прызначаны начальнікам рускай духоўнай місіі ў Іерусаліме, у сувязі з чым узведзены ў сан архімандрыта. Мітрапаліт Павел таксама прадстаўляў Рускую праваслаўную царкву ў ЗША, Канадзе і Еўропе. Зараз Уладыка з'яўляецца рэктарам Інстытута тэалогіі пры БДУ. Дэкан факультэта міжнародных адносін Віктар Шадурскі павіншаваў мітрапаліта Паўла з днём нараджэння (19 лютага).

Мітрапаліт пачаў сустрэчу з гутаркі пра пераход студэнтаў у дарослае жыццё. Уладыка падкрэсліў, што гэта час, калі зараджаецца каханне і сяброўства. Ён шмат казаў пра веру, распавёў пра адзін перыяд жыцця, калі быў намеснікам Пскова-Пячэрскага манастыра.

Кажучы пра запаведзі, Уладыка адзначыў, што не варта ўспрымаць іх літаральна і людзі могуць рабіць добрыя справы, не выходзячы з дома. Мала мець даброты на зямлі, чалавек павінен імкнуцца ўвайсці ў Царства Нябеснае.

Далей мітрапаліт павіншаваў усіх прысутных з пачаткам Вялікага посту. Уладыка завастрыў увагу на тым, што абмежаванне ў ежы – гэта толькі сродак. Галоўная ж мэта – навучыцца кіраваць сабой. Падчас посту павінна быць гармонія, не павінна быць ні гневу, ні лютасці, ні зайздрасці. Чалавек павінен навучыцца кіраваць сваімі пачуццямі і думкамі, а задача царквы – дапамагчы чалавеку змяніцца.

Затым мітрапаліт Павел адказаў на пытанні аўдыторыі. Цікавасць прысутных выклікалі вялікапосныя навучанні Уладыкі, факты з яго духоўнай місіі і кароткага перыяду свецкага жыцця. Патрыяршы Экзарх нагадаў прысутным словы апостала Паўла: «Усё мне дазвольна, але не ўсё карысна; усё мне дазвольна, але нішто не павінна валодаць мною». Усе прысутныя патрапілі пад шчырую абаяльнасць гэтага неардынарнага чалавека. У канцы сустрэчы ён падзякаваў за ўвагу і пакінуў запіс у кнізе для ганаровых гасцей.

Жанна ВАСАНСКАЯ

РЭЗАНАНС

БДУ зноў наперадзе!

Па выніках сусветнага вэбаметрычнага рэйтынгу ўніверсітэтаў Webometrics Ranking of World Universities БДУ заняў 612 месца! Такім чынам, наша ВНУ на працягу паўгода паднялася на 61 прыступку.

Belarus

ranking	World Rank	University	Det.	Presence Rank*	Impact Rank*	Openness Rank*	Excellence Rank*
1	612	Belarusian State University / Белорусский государственный университет		769	1434	38	1002
2	2039	Grodno State University / Гродненский государственный университет Янки Купалы		2375	3169	264	3826
3	2230	Belarusian National Technical University / Белорусский национальный технический университет		1939	5174	310	3272
4	2952	Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics / Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники		5362	5631	776	3695
5	2980	Polessky State University / Полесский государственный университет		4360	2193	2121	5414
6	3059	Belarusian State Medical University / Белорусский государственный медицинский университет		6779	4569	601	4421
7	3338	Gomel State University / Гомельский государственный университет Франциска Скорины		2558	8902	855	3596

Адзначым, што сярод краін СНД БДУ саступіў толькі найстарэйшым ВНУ: Маскоўскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя М. В. Ламаносава і Санкт-Пецярбургскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту.

Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУ Аляксей Толсцік адзначыў: «Наша ВНУ ўвесь час удзельнічае ў сусветных рэйтынгах, якія адлюстроўваюць прадстаўленасць універсітэта ў сусветнай навукова-адукацыйнай прасторы. У снежні 2013 г. па версіі расійскага агенцтва «Інтэрфакс» Белдзяржуніверсітэт заняў другое месца пасля МДУ ў рэйтынгу ВНУ краін СНД, Грузіі і Балтыі. У 2014 г. вядомае брытанскае агенцтва QS (QS World University Rankings) уключыла БДУ ў лік 500 найлепшых універсітэтаў свету. У снежні 2014 г. былі апублікаваны вынікі новага рэйтынгу найлепшых універсітэтаў краін у стадыі развіцця Еўропы і Цэнтральнай Азіі. Сярод 368 універсітэтаў з 30 краін Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт увайшоў у топ-50 найлепшых ВНУ гэтага рэгіёна, заняўшы 38 месца.

І вось цяпер новы поспех у **рэйтынгу Webometrics.** Безумоўна, нам прыемна ўсведамляць, што мы чарговы раз трапляем у 2 % найлепшых універсітэтаў свету. Як вядома, арганізатары Webometrics Ranking of World Universities праналізавалі 22000 вышэйшых навучальных устаноў (усяго ў свеце звыш 30000 ВНУ – *заўв. рэд.*). Атрыманыя вынікі на працягу адзінаццаці гадоў апрацоўвае іспанская даследчая лабараторыя Laboratorio de Internet. Дадзеныя абнаўляюцца два разы ў год: у студзені і ліпені. Вышэйшыя навучальныя ўстановы ранжыруюцца па чатырох паказчыках, якія характарызуюць узровень навуковых публікацый і прысутнасць універсітэтаў у сусветнай навукова-адукацыйнай інтэрнэт-прасторы: ***«уплыў»*** – цытаванасць сайта, ***«прысутнасць»*** – памер сайта, ***«адкрытасць»*** – колькасць файлаў па дадзеных пошукавай сістэмы Google і ***«якасць»*** – колькасць публікацый супрацоўнікаў універсітэта па дадзеных Scopus, што патрапілі ў 10 % найбольш цытаваных у свеце. У прыватнасці, у нас істотна палепшылася бачнасць у інтэрнэце (спасылкі), што тлумачыцца нашай актыўнай пазіцыяй па прасоўванні БДУ ў сетцы. Пры гэтым па параметры «адкрытасць», які характарызуе наяўнасць навучальных і навуковых матэрыялаў на сайце ўніверсітэта, БДУ займае 38 месца ў свеце.

І тут вялікі ўклад нашай фундаментальнай бібліятэкі. Яна адна з першых у Беларусі пачала працу па рэгістрацыі ў сусветных базах дадзеных паўнатэкставых навуковых публікацый, навучальных і метадычных матэрыялаў навукоўцаў і выкладчыкаў універсітэта, а таксама часопісаў, якія выдаюцца ў БДУ. Электронная бібліятэка Белдзяржуніверсітэта ўвайшла ў першую сотню найлепшых бібліятэк свету. Гэта першы ў Беларусі паказчык такога ўзроўню».

Акрамя таго, у студзені мінулага года БДУ ўзначаліў рэйтынг айчынных устаноў вышэйшай адукацыі па выніках прыёмнай кампаніі 2013 г. У гэтым даследаванні Міністэрства адукацыі нашай краіны ўдзельнічала 48 беларускіх ВНУ. Дарэчы, другое месца заняў БНТУ, а трэцяе – БДУІР.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

Чытайце ў нумары:

МУЗЫКА ВЯСНЫ СЯМ'І НАВУМОВІЧАЎ
Расповед пра адну з самых яркіх універсітэцкіх дынастый
Стар. 2

ГЭТА БЫЎ ДЛЯ МЯНЕ ЗНАК
Прафесар Генадзь МЯДЗВЕДЗЕЎ прыгадвае свой шлях і пачаткі «актуарнай матэматыкі»
Стар. 3

ОЙ, ХАДЗІЎ КАРАГОД КАЛЯ НАШЫХ ВАРОТ…
Студэнты БДУ маляўніча сустрэлі Масленіцу
Стар. 4

Весткі з рэктарата

ДОШКА ПАШАНЫ БДУ ўрачыста абноўлена 24 лютага. У цырымоніі прынялі ўдзел рэктар акадэмік Сяргей Абламейка, прадстаўнікі адміністрацыі факультэтаў, выкладчыкі і студэнты ВНУ.

Па традыцыі на Дошку пашаны занесены імёны і фатаграфіі 32 супрацоўнікаў і 32 навучэнцаў. Такога гонару яны ўдастоены за заслугі і дасягненні ў адукацыйнай, навуковай, метадычнай, інавацыйнай, кіраўнічай і спартыўнай дзейнасці па выніках 2014 г.

* * *

ДЗВЕ ГРАМАТЫ Міністэрства адукацыі нашай краіны ўручаны калектыву БДУ. Першая ўзнагарода «За высокую пазіцыю сярод устаноў вышэйшай адукацыі ў міжнародных рэйтынгах». У сусветным рэйтынгу Webometrics БДУ падняўся на 61 пазіцыю і заняў 612 месца, увайшоўшы ў тройку найлепшых універсітэтаў СНД. Другая грамата ўручана за развіццё экспарту паслуг ва ўстановах вышэйшай адукацыі. У 2014 г. у БДУ было прынята каля 1 тысячы замежных грамадзян.

* * *

ОРДЭН імя К. Э. Цыялкоўскага Федэрацыі касманаўтыкі Расіі ўручаны рэктару БДУ акадэміку Сяргею Абламейку. Гэтай узнагароды ён ганараваны за ўнёсак у распрацоўку і рэалізацыю праектаў і праграм даследаванняў касмічнай прасторы. Ордэн імя К. Э. Цыялкоўскага з'яўляецца вышэйшым знакам адрознення і грамадскага прызнання заслуг спецыялістаў ракетна-касмічнай галіны.

* * *

ДАМОВА аб супрацоўніцтве падпісана паміж БДУ і Уральскім федэральным універсітэтам імя першага Прэзідэнта Расіі Б. М. Ельцына. Прадугледжваецца абмен студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі і выкладчыкамі, інфармацыяй па навучальна-метадычнай працы; рэалізацыя сумесных даследчых праектаў і арганізацыя навуковых, адукацыйных і культурных мерапрыемстваў.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ЛЁСАМ ЗЛУЧАНЫЯ З БДУ

Музыка вясны сям'і Навумовічаў

Летась ва ўніверсітэце было зладжана свята сямейных дынастый «Лёсам злучаныя з БДУ». Пачынальнікі адной з найбольш прыкметных дынастый Уладзімір і Людміла Навумовічы адсвяткавалі нядаўна залатое вяселле. Усе 50 гадоў сумеснага жыцця яны разам прапрацавалі ў альма-матар, выхавалі дзяцей і гадуюць унукаў.

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

Універсітэцкая дынастыя Навумовічаў на залатым вяселлі Уладзіміра і Людмілы

Уладзімір і Людміла зноў, як у 20 гадоў, прызнаюцца адзін аднаму ў каханні і абменьваюцца залатымі пярсцёнкамі ў ЗАГСе. Гэта пра іх можна сказаць, як пра зорак, што ў свае сталыя гады яны яшчэ лепшыя, чым у юнацтве: папрыгажэўшыя і памудрэўшыя, са сваім асноўным багаццем – гадамі, пражытымі разам «у горы і радасці». Дарэчы, пра зорак – не перабольшванне. Навумовічы ў БДУ навідавоку.

ЯНА НЕ СКАЗАЛА ЯМУ «НЕ»

Пачынаючы са студэнцкіх часоў абодва былі ў віры грамадскага жыцця, дасягнулі многага і займелі шмат сяброў. Уладзімір Аляксандравіч – дацэнт, кандыдат філалагічных навук, эксперт гісторыі беларускай літаратуры, а Людміла Арсеньеўна – былы вядучы інжынер і кіраўнік аддзела патэнтава-вынаходніцкай працы НДЧ, а сёння салістка хору супрацоўнікаў БДУ «Родніца». Усё жыццё яны былі звязаны творчасцю.

Вось і на днях з друку выйшла новая кніжка Уладзіміра Аляксандравіча пра іх каханне і жыццё з Людмілай Арсеньеўнай пад назвай «НЕТ», и как его сказать». У ёй жыццё галоўнага героя руйнавалася разам з савецкімі каштоўнасцямі, аднак душа гарэла ад таго, што яна не сказала яму «не». Уладзімір Навумовіч называе толькі што надрукаваную кніжку «сваім «Ціхім Донам». Яму, як і галоўнаму герою гэтага рамана, калісьці прыходзілася адстойваць сваё пачуццё і нават змагацца за каханую.

З таго часу, як ён першы раз убачыў Людмілу Арсеньеўну, прайшло шмат гадоў. Аднак Уладзімір Аляксандравіч прызнаецца, што нават сёння гатовы зрабіць усё, каб заслужыць увагу і позірк сваёй жонкі. Ён гатовы і цяпер ёй дагаджаць, угадваць усе яе жаданні, імкнуцца, каб яна як мага лепш выглядала. «Бо і сама жанчына гэтага вартая», – гаворыць Уладзімір Аляксандравіч.

Людміла Арсеньеўна дагэтуль беражэ паштоўку, у якой Уладзімір Аляксандравіч віншуе яе з шаснаццацігоддзем. Колькі сябе памятае, з юнацкіх гадоў была на сцэне, спявала. Яе голас адразу заваражыў новага вучня, які перайшоў у іх школу з сямігодкі. З таго часу яны на сцэне былі заўсёды разам: яна спявала, а ён чытаў вершы. Іх вёскі знаходзіліся недалёка ад гістарычнага Міра. І «маладыя артысты» ў складзе школьнай групы часта ездзілі туды выступаць.

Па сутнасці сёння нічога не змянілася. Уладзімір Аляксандравіч – першы госць на канцэртах хору «Родніца», дзе саліруе яго жонка. А яна – першы чытач яго кніг. Людміла Арсеньеўна нават дала назву адной з аповесцяў Уладзіміра Аляксандравіча «Такое бывае аднойчы». Яна напісана пра іх каханне і выйшла асобнай кніжкай.

«Я заўсёды ведаю, над чым працуе мой муж, якія творчыя задумы выношвае, – дзеліцца Людміла Арсеньеўна. – У першыя гады нашага знаёмства ён падараваў мне шмат паэтычных зборнікаў. Яны і цяпер стаяць у шафе».

Тое, як Уладзімір Аляксандравіч чытае на публіцы вершы, ведаюць усе ўдзельнікі паэтычных вечароў у БДУ. Беларускае слова льецца ў яго з душы. Нават яго галасавыя звязкі, здаецца, настроены на мілагучнасць, поўнагалоссе, шырыню і непаўторнасць роднай мовы. «Напэўна, ніхто не ведае да канца літаратуру свайго народа, – лічыць Уладзімір Навумовіч. – Яна – аснова нацыянальнага побыту, культуры, нацыянальнай самасвядомасці». Калі з друку выйшаў яго вучэбны дапаможнік для сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў «Беларуская літаратура» і паўстала задача выпусціць да яго дыск, Уладзімір Аляксандравіч вырашыў, хто, як не ён, прачытае прозу і паэзію да яго. Каля пяці гадзін без перадыху ён начытваў тэкст у запісвальнай студыі выдавецтва «Вышэйшая школа». Сёння кожны студэнт можа пачуць паэтычны голас Уладзіміра Навумовіча на лекцыі. Уладзімір Аляксандравіч – цудоўны лектар. Ён заходзіць у шумную аўдыторыю, якая занятая сваімі справамі, а выходзіць пад апладысменты студэнтаў.

ЯНЫ РАЗУМЕЛІ АДЗІН АДНАГО

Уладзімір Навумовіч расказвае, што голас Людмілы Арсеньеўны адразу зачараваў яго. Ён і зараз ведае, як толькі Людміла Арсеньеўна заспявала, усе паклоннікі каля яе ног. «Я заўсёды зайздросціў людзям, якія маюць такі талент, – распавядае Уладзімір Аляксандравіч. – І, калі мая жонка праяўляе сціпласць і кажа, што яна застольная спявачка, я не згаджаюся». Людміла Арсеньеўна сапраўды ніколі не думала, што яе голас такі ўжо незвычайны, хоць і не праміналa выпадку, каб паспяваць. Калі Уладзімір Аляксандравіч стаў настойваць, каб яна скончыла кансерваторыю, то не пайшла, цяпер нават і не памятае дакладна, з якой прычыны. Зараз у яе жыцці, калі выраслі дзеці і стала паболей часу, засталіся толькі спевы. Некалькі разоў на тыдзень яна наведваецца на рэпетыцыі хору супрацоўнікаў БДУ «Родніца».

Раней, пасля заканчэння хімічнага факультэта БДУ, працавала ў Інстытуце фізіка-арганічнай хіміі АН Беларусі. Затым – на мінскім заводзе «Калібр». Там, па яе словах, яна зарабляла немалыя на той час грошы, да 400 рублёў, калі многія атрымлівалі па 120. Паколькі вытворчасць была ваенная, то дзяцей у дзіцячы садок заводзіў і забіраў муж, які тады быў аспірантам БДУ. На розныя дзіцячыя мерапрыемствы таксама хадзіў ён. Аднак не варта думаць, што толькі яна прыносіла грошы ў дом, папярэджвае Людміла Арсеньеўна. Уладзімір Аляксандравіч быў ленінскім стыпендыятам. Яна памятае, як ён прывёз ёй з Амерыкі два футры, карычневае і белае, і ёй зайздросцілі многія. «У дэлегацыю ЦК ВЛКСМ ад Беларусі на IV сустрэчу савецкай і амерыканскай моладзі ў Чыкага (ЗША) у 1975 годзе пасля хельсінскіх пагадненняў Уладзімір Навумовіч быў уключаны як малады кандыдат навук, сакратар камітэта камсамола БДУ», – ганарыцца яна.

Людміла Арсеньеўна гаворыць, што яны заўсёды з мужам разумелі адзін аднаго. Калі яму патрэбна было ехаць у камандзіроўку за мяжу, яна ніколі не пярэчыла. Ды і сама часта выпраўлялася на навуковыя канферэнцыі ў Ленінград і Маскву, калі пасля заканчэння Інстытута патэнтазнаўства ў Маскве перайшла працаваць у аддзел патэнтава-вынаходніцкай працы НДЧ БДУ. Яна не пагаджаецца, што праца, звязаная з патэнтамі, сумная ў параўнанні са спевамі. Дзякуючы ёй Людміла Арсеньеўна змагла пазнаёміцца з цікавымі навукоўцамі, даведацца пра важныя навуковыя вынаходствы. Паколькі за ёю быў замацаваны хімічны факультэт, то яна магла іх адсачыць і зразумець. Людміла Навумовіч памятае, як Рэгіна Антонаўна Міхайлава доўга чакала яе, пакуль яна скончыць працу ў аддзеле, каб адвесці ў актавую залу ўніверсітэта на агляд мастацкай самадзейнасці факультэтаў. Дзякуючы яе настойлівасці Людміла Арсеньеўна і патрапіла ў хор. Разам з хорам яна пабывала ў многіх краінах свету: Германіі, Нарвегіі, Турцыі, Італіі, Македоніі, Балгарыі і іншых.

Дзеці да гэтага часу падраслі. Наогул, з імі ніколі не было ніякіх цяжкасцяў. Дзяўчаты былі самастойнымі. Пасля заняткаў у сярэдняй навучальнай школе самі ездзілі ў музычную вучыцца іграць на фартэпіяна. Аднак прафесіі выбралі нечаканыя для бацькоў.

ІХ СУМЕСНАЕ ЖЫЦЦЁ СТАЛА ПРЫКЛАДАМ

Пасля школы старэйшая Наталля паступіла ў медыцынскі ўніверсітэт і стала стаматолагам. А малодшая Таццяна пасля заканчэння юрыдычнага факультэта БДУ каля 20 гадоў працавала ў гарадской калегіі адвакатаў і дапамагала людзям адстойваць свае інтарэсы ў судах. Сёння Таццяна Уладзіміраўна выкладае канстытуцыйнае права і канстытуцыйна-прававую абарону асабістай недатыкальнасці на кафедры канстытуцыйнага права юрыдычнага факультэта БДУ.

Цікава, што і Таццяна і Наталля пасля шлюбу не захацелі мяняць прозвішчы і так і засталіся Навумовіч. Болей за тое, у абедзвюх – мужы Валодзі, як і іх бацька. Камусьці гэта можа падацца супадзеннем, аднак Таццяна Навумовіч гаворыць, што для іх з маленства прыкладам у асабістым жыцці заставаліся бацькі. Бацька Уладзімір Аляксандравіч заўсёды клапаціўся пра сваіх дачок, сёння з яго атрымаўся цудоўны дзядуля. Таму імя Валодзя і стала для іх лёсавызначальным.

Хутка сярэбранае вяселле будзе святкаваць са сваім мужам Валодзем старэйшая Наталля. Крыху менш, 21 год, замужам малодшая дачка Навумовічаў Таццяна, якая выкладае на юрыдычным факультэце. Першая выхавала дзве дачкі, другая мае двух сыноў.

Старэйшая ўнучка Навумовічаў Валерыя ў гэтым годзе заканчвае аддзяленне рамана-германскіх моў філалагічнага факультэта. Старэйшы ўнук Максім вучыцца на першым курсе факультэта міжнародных адносін. Яны, як калісьці іх бабуля і дзядуля, выбралі БДУ. А ўнучка Таццяна, якой 13 гадоў, як і Уладзімір Аляксандравіч, зацікавілася літаратурай. Аднак у адрозненне ад яго яна піша вершы. І выдала свой першы паэтычны зборнік «Музыка вясны». У малодшага ўнука Дзяніса праявіліся вакальныя здольнасці. Ён вучыцца ў школе з артыстычным ухілам і спявае, як бабуля.

На вяселлі Уладзіміра Аляксандравіча і Людмілы Арсеньеўны Навумовічаў ужо дарослыя дзеці і ўнукі: дзве дачкі, дзве ўнучкі, два ўнукі. Бацькоўскі прыклад сумеснага жыцця стаў для іх прыцягальным. Уладзімір Аляксандравіч жартуе, што не памятае сябе нежанатым. Людміла Арсеньеўна дае рэцэпт шчаслівага шлюбу: «Варта выходзіць замуж толькі, калі кахаеш. Тады і разводу можна пазбегнуць». Навумовічаў на працягу жыцця каля 50 разоў запрашалі быць сватамі. Уладзімір Аляксандравіч вёў вяселлі, чытаў на іх вершы, жарты, віншаванні. Людміла Арсеньеўна – спявала. Навумовіч ніколі не браў грошай. А толькі прасіў на памяць саматканы ручнік свата як напамін пра тое, што зрабіў добрую справу – стварыў яшчэ адну маладую сям'ю. Сёння ён можа пахваліцца цэлым стосам такіх ручнікоў. Дарэчы, ні адна пара, на вяселлі якой Навумовічы былі сватамі, не развялася.

Ганна ЛАГУН

АСОБЫ

Заснавальніку кафедры тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі ФПМІ прафесару **Генадзю МЯДЗВЕДЗЕВУ споўнілася 80 гадоў.**

Гэта быў для мяне знак

У кожнай эпохі ёсць свае героі і вышэйшыя каштоўнасці, правілы і законы, ідалы і ідэалогіі. Мы не маем права судзіць час – ён сам нас рассудзіць. У нас таксама няма магчымасці змяніць мінулае, але мы можам успамінаць яго, ганарыцца ім ці проста быць троху абыякавымі да яго. Усе людзі перажываюць свае нейкія асаблівыя пачуцці да пражытых гадоў, няхай гэта будзе дзяцінства, юнацкасць, сталасць...

Мы вучымся ў найлепшым універсітэце краіны, на выдатных факультэтах і ўлюбёных кафедрах. Але часцяком мы не ведаем ні гісторыі, ні тых, хто стаяў ля вытокаў, хто быў апантаны імкненнем да ведаў і новых адкрыццяў і спадзяваўся перадаць сваё самае патаемнае нам – цяперашнім студэнтам.

Слухаеш голас за кадрам, імкнешся злавіць кожнае слова, кожную фразу, каб не страціць атмасферы, якая пануе ў душы чалавека, які цалкам прысвяціў сябе сваёй справе!

– Генадзь Аляксеевіч, як у Вас з'явілася любоў да матэматыкі і фізікі?

– Можна сказаць, вялікай любові спачатку не было. Яна неяк так узнікла. Прынамсі, я зразумеў, што штосьці магу. Адбыўся такі выпадак у класе шостым, напэўна... Быў урок геаметрыі ў нас. Прыйшоў правяральшчык – гэта дзесьці канец 40-х гадоў, строгія часы былі, настаўнікі баяліся ўсялякіх праверак. А мяне тады выклікалі да дошкі. У нас было так уладкавана: дошка ад сценкі аддзялялася на метр, і звычайна выклікалі двух вучняў (адзін з аднаго боку рыхтуецца, а другі – за дошкай). Вось я і патрапіў туды: паміж дошкай і сценкай. Мне трэба было даказаць нейкую тэарэму, а я яе не вывучыў. Пачаў цяміць і неяк даказаў. Потым ужо, калі вучань, які стаяў перад класам, скончыў, дошку перавярнулі, і я пачаў распавядаць. Усё распавёў, мне паставілі адзнаку, а пасля ўрока да мяне падышоў настаўнік і спытаў: «Дзе такі доказ прачытаў, ён не супадае з тым, што ў падручніку?» Гэта быў для мяне знак. Потым у мяне матэматыка пайшла нядрэнна. Вялікай любові я не адчуваў: у тыя часы героямі былі вайскоўцы.

– Вы чалавек з вялікім досведам у навуковай і выкладчыцкай дзейнасці. Якую даследчую працу Вы б вылучылі як самую цікавую?

– Яна ўся цікавая. Калі б не была цікавай, я б і не працаваў. Але магу ўзгадаць незвычайную працу – цяпер ужо сакрэтаў вялікіх няма. У 50-х гадах у Еўропе размяшчаліся амерыканскія базы, і яны былі ўкамплектаваны кіравальнымі рэактыўнымі снарадамі – там быў такі рэактыўны снарад «Матадор». Ён кіраваўся па радыё, ну і, натуральна, нейкае процідзеянне ў Савецкім Саюзе прыдумлялася. Нам прапанавалі наступную працу. Нейкім чынам быў выкрадзены канспект амерыканскага афіцэра, які навучаўся кіраванню «Матадорам», і там была апісана ўся сістэма і дэталі. І вось нам прывезлі гэты канспект. Мы павінны былі прачытаць, разабрацца і стварыць спосаб процідзеяння гэтаму снараду (бо ён кіраваўся па радыё, значыць, спосаб радыёпроцідзеяння). І нам атрымалася тое зрабіць. Натуральна, у справе нашы разлікі не выкарыстоўваліся, паколькі нападу на СССР не было.

– Як прыйшла ідэя адкрыць спецыяльнасць «актуарная матэматыка»?

– Па-першае, фінансаванне навуковай працы было галоўным чынам з Расіі, з цэнтра, а калі з'явілася незалежная Беларусь, то знікла магчымасць працаваць па той тэматыцы, па якой працавалі раней. Па-другое, кіраўніцтва патрабавала, каб спецыяльнасці былі не нейкімі абстрактнымі, навуковымі, а каб яны былі практычнымі. Мы думалі, меркавалі – нам трэба было пераарыентавацца. І вось аднойчы, калі я быў у камандзіроўцы ў Маскве, я сустракаўся са сваім вучнем – Міхаілам Лугачовым. Цяпер ён з'яўляецца загадчыкам кафедры эканамічнай інфарматыкі ў МДУ, а ў той час, у 1992 г., ён загадваў навучальнай лабараторыяй на эканамічным факультэце. Ён распавёў, што да іх часта прыязджаюць замежнікі, прапануюць супрацоўніцтва, што ёсць такія цікавыя статыстычныя, імавернасныя тэматыкі. У МДУ гэтай справай ніхто не цікавіўся, і ён прапанаваў мне іх кантакты і даў мне штук пяць візітовак – там былі амерыканцы, англічане, канадцы, палякі. Я напісаў ліст, што ёсць такі калектыў у нас, у БДУ, які цікавіцца статыстыкай, імавернасным аналізам, і разаслаў па гэтых адрасах. Адгукнуліся амерыканцы, з Канады таксама быў адказ. Вось так усё і пачыналася. Яны нам дапамаглі метадычнымі дапаможнікамі, мы шмат чаго новага атрымалі. На кафедры ёсць цэлая шафа, дзе змяшчаецца амерыканская літаратура. Гэта падштурхнула нас распрацаваць такую спецыяльнасць. А адкрылася яна ў 1993 г. Першы прыём быў толькі платным, а на наступны год Міністэрства адукацыі ўбачыла, што грамадству быў цікавы прапанаваны курс, і выпускі бюджэтныя месцы.

Знакамітага акадэміка Калмагорава неяк спыталі: «Хто такія матэматыкі?» І ён сказаў: «А, гэта такія карысныя хатнія жывёлы. Але насамрэч мы ўсе, вядома, не матэматыкі, не фізікі, не камуністы, а проста людзі. І калі пра кожнага штосьці казаць, ужо не гумар, а жыццё пачынаецца». Дык вось, гэта жыццё доктара фізіка-матэматычных навук прафесара Генадзя Мядзведзева.

Гутарыла
Вольга БОНДАРАВА

Глыбокапаважаны Генадзь Аляксеевіч!

Ад шчырай душы віншуем Вас з юбілеем. Жадаем дужага здароўя, новых навуковых здзяйсненняў, поспехаў у педагагічнай дзейнасці, бадзёрасці духу, гармоніі, вясновага настрою, шчасця Вам і вашым блізкім.

Супрацоўнікі і студэнты кафедры тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

04 сакавіка Цемушаў Сцяпан Мікалаевіч дацэнт кафедры гісторыі Расіі
05 сакавіка Губкіна Алена Васільеўна дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы
12 сакавіка Караткевіч Аляксей Іванавіч загадчык кафедры банкаўскай эканомікі
15 сакавіка Антаневіч Ірына Юр'еўна начальнік Галоўнага ўпраўлення планавання, эканомікі і інвестыцыйнай дзейнасці
18 сакавіка Марозаў Валерый Аляксандравіч дацэнт кафедры тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі
19 сакавіка Анішчык Віктар Міхайлавіч дэкан фізічнага факультэта
25 сакавіка Саніковіч Ірына Міхайлаўна дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры
29 сакавіка Гутоўская Марына Сцяпанаўна дацэнт кафедры англійскага мовазнаўства

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, інжынернай геалогіі і геафізікі, эканамічнай геаграфіі Беларусі і дзяржаў Садружнасці, тэорыі і практыкі перакладу, экалогіі чалавека,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнай фізікі і астрафізікі, інжынернай геалогіі і геафізікі, крыміналістыкі,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: медыялогіі і вэб-журналістыкі, перыядычнага друку, неарганічнай хіміі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, арганічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін, мікрабіялогіі, фізіялогіі чалавека і жывёл, батанікі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, агульнай фізікі, тэарэтычнай фізікі і астрафізікі, інжынернай геалогіі і геафізікі, фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм, псіхалогіі, фізічнага выхавання і спорту, менеджменту і арганізацыі аховы здароўя, агульнай і клінічнай псіхалогіі, агульнанавуковых дысцыплін, гісторыі Расіі,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай хіміі, літаратурна-мастацкай крытыкі, медыялогіі і вэб-журналістыкі, аналітычнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, біяфізікі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, камп'ютарнага мадэлявання, лазернай фізікі і спектраскапіі, тэарэтычнай фізікі і астрафізікі, геадэзіі і картаграфіі, інжынернай геалогіі і геафізікі, агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, сацыяльнай камунікацыі, філасофіі і метадалогіі навукі, філасофіі культуры, фізічнага выхавання і спорту, інфармацыйных тэхналогій, культуралогіі, нямецкай мовы, агульнанавуковых дысцыплін, тэорыі і практыкі перакладу, фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці, псіхалогіі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, крыніцазнаўства,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: тэхналогій камунікацыі, інжынернай геалогіі і геафізікі, фізічнага выхавання і спорту, гісторыі новага и найноўшага часу, крыніцазнаўства,

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРЫ арганічнай хіміі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Абранне рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі замежным членам (акадэмікам) Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук – БелТА, 21.by, generation.by (10.02), news.rambler.ru (11.02), infoshos.ru, souyz.by (12.02).

БДУ ўвайшоў у тройку найлепшых універсітэтаў СНД па апошніх дадзеных Сусветнага вэбаметрычнага рэйтынгу ўніверсітэтаў (Webometrics Ranking of World Universities) – megacat.by (10.02), tut.by, БелТА, 21.by, kv.by, sb.by, freesmi.by, belnovosti.by, embassybel.by, novoteka.ru, generation.by, minsknews.by, zviazda.by (11.02), itogi.info, kp.by, nv-online.info/by (12.02), «Камсамольская праўда» (13.02), zviazda.by (15.02), «Настаўніцкая газета» (17.02).

Пра перамогу выкладчыка ФРКТ БДУ Яўгеніі Лісіцы ў намінацыі «Найлепшы інавацыйны праект» Рэспубліканскага конкурсу інавацыйных праектаў – «Рэспубліка», respublika.info (02.01), «Настаўніцкая газета», nastgaz.by (06.01), АНТ (17.01).

Міжнародны фэст «Тэатральны куфар–2015» абвясціў пра пачатак прыёму заявак – offine.news.by, tut.by, 21.by, megacat.by (09.01), 162.by, БелаПАН (11.01), eurasianform.com (12.01), БелТА (22.01).

Першы Еўразійскі студэнцкі навуковы форум стартуе ў БДУ – БелТА, 21.by, megacat.by (15.01), soyuz.by (16.01).

Пра ўнікальную распрацоўку навукоўцаў БДУ «Лігнасорб», прызначаную для ліквідацыі аварыйных разліваў нафты і нафтапрадуктаў на паверхні акваторый і сушы – megacat.by (15.01), ej.by, n1.by, 21.by, БелТА, webground.su (18.01), ipng.ru, subscriber.ru, banknotes.by, angi.ru, ru.news.meta.ua, finatica.by, mil.by, ecopress.by, geoversum.by (19.01), zviazda.by (20.01), МДТРК «Мир», АТН (БТ-1) (22.01), sb.by (27.01).

Перамога ліцэістаў БДУ на Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіядзе школьнікаў па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы (Казахстан) – БелТА, novoteka.ru, newsfiber.com, telegraf.by, megacat.by (20.01), ecopress.by (21.01), «Настаўніцкая газета» (05.02).

Першакурснік механіка-матэматычнага факультэта БДУ Павел Бацылеў стварыў мабільны дадатак на беларускай мове «У саюз з сябрамі» – БелТА, kv.by, aif.by (20.01), charter97.org, tut.by, mir.pravo.by, udf.by, belaruspartisan.org, nv-online.info.by, 21.by, onliner.by (21.01), providesr.by, sb.by, «Звязда», «Рэспубліка», respublika.sb.by, АНТ, gomelmedia.by (22.01).

Урачыстае ўшаноўванне ў БДУ лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў – СТБ (21.01), ТБ-24ДОК, радыё «Сталіца», minsknews.by, СТБ, БелаПАН, АТН (БТ-1) (22.01), «Мінскі кур'ер» (23.01), megacat.by (04.02).

На хімічным факультэце БДУ распрацаваны новыя лекавыя формы таблетак антыбіётыкаў, якія дазваляюць замяніць іх ін'екцыйныя формы – souyz.by (23.01), sb.by, aif.by, БелТА, tut.by, 5min.by, inn-minsk.by, belnovosti.by, n1.by, newsbel.by, Interfax.by, udf.by, naviny.by (25.01), moyby.com, map.by, profi-forex.by, pharmreview.kz, belnovosti.by, farmsouz.by, jobmarine.by (26.01).

Імпрэза 25-годдзя Ліцэя БДУ – Kv.by, telegraf.by, ru.redtram.by, novostisegodnya.com (28.01).

Адкрыццё ў БДУ акадэміі вэб-адукацыі – БелТА, megacat.by, electroname.com (04.02), mil.by, cenadm.gov.by, mag.relax.by (05.02), minsknews.by (06.02).

Моладзевы праект «#апоехали» стартаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце – megacat.by (04.02), БелТА, 21.by (05.02), АНТ (06.02).

Пра падпісанне дамовы паміж БДУ і Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь – nv-online.info, mk.by, БелТА (06.02), naviny.by (07.02), mail.ru (08.02).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

Медыя ад Лісабона да Уладзівастока

19 лютага Інстытут журналістыкі БДУ, Беларускі саюз журналістаў і рэдакцыя газеты «Рэспубліка» правялі IV міжнародную канферэнцыю **«Міжнародная журналістыка–2015:** фарміраванне інфармацыйнай прасторы партнёрства ад Уладзівастока да Лісабона і медыя».

Як адзначыла загадчыца кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры прафесар *Таццяна Дасаева,* дадзены форум праходзіў у няпросты час. Мы назіраем трансфармацыю сучаснай журналістыкі ва ўмовах глабалізацыі сусветнай інфармацыйнай прасторы.

Удзельнікі канферэнцыі звярнуліся да актуальных пытанняў міжнароднай журналістыкі, перспектыў яе развіцця і шляхоў супрацоўніцтва ў медыйнай сферы.

У дыскусіях апроч беларускіх навукоўцаў і практыкаў бралі ўдзел прадстаўнікі ўніверсітэцкай навукі Расіі, Украіны, Казахстана і Польшчы. Яны абмеркавалі асаблівасці асвятлення інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы ў рамках ЕўрАзЭС, Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, спецыфіку медыйнага забеспячэння беларускакітайскага і беларуска-венесуэльскага супрацоўніцтва, інфармацыйныя нагоды міжнародных канфліктаў. Акрамя таго, была звернута ўвага на вопыт і навацыі замежнай журналістыкі, а таксама найноўшыя прыёмы працы ў інтэрнэце. Вынікамі сваіх даследаванняў падзяліліся навукоўцы з універсітэтаў Астаны, Белгарада, Днепрапятроўска, Данецка, Запарожжа, Калугі, Камянца-Падольскага, Кіева, Кустаная, Львова, Майкопа, Познані, а таксама айчынных ВНУ – БДТУ, Магілёўскага інстытута МУС РБ, Брэсцкага дзяржуніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Разам з прадстаўнікамі ўніверсітэцкай навукі, журналістамі-практыкамі ў дыскусіі па актуальных пытаннях міжнароднай журналістыкі прынялі ўдзел і маладыя даследчыкі: аспіранты, суіскальнікі, магістранты, студэнты.

Дацэнт Леанід ЛАХМАНЕНКА

УНІВЕРСІТЭТ

28 лютага 2015 года, № 3 (2127)

СВЯТКАВАННІ

Ой, хадзіў карагод каля нашых варот!

Студэнты БДУ ў суботу 21 лютага ва ўніверсітэцкім дворыку маляўніча сустрэлі Масленіцу.



Фота Аляксандра СНАПКА і Ганны ЗАНКОВІЧ

Масленіца – адно з самых яркіх і вясёлых народных святаў, якое дагэтуль спраўляюць беларусы. Свята сімвалізуе канец непагодлівай зімы і прыход доўгачаканай вясны. Спрадвеку Масленіцу святкавалі ярка: спальвалі традыцыйнае пудзіла, каталіся на санках, гулялі ў разнастайныя гульні і, вядома ж, пяклі апетытныя бліны, якія з'яўляюцца знакам сонца.

Зладзіць Масленіцу ў БДУ і зрабіць гэтае свята традыцыяй вырашыла пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў. Ініцыятары Масленіцы не сталі адыходзіць ад народных звычаяў і правялі гэта сонечнае свята па ўсіх правілах. Гонар «разрэзаць чырвоную стужку» дастаўся прарэктару па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзіміру Сувораву. Са святочнай прамовай выступіла і старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў Вольга Локцева.

На ўваходзе студэнтаў, выкладчыкаў і гасцей БДУ сустракалі вясёлыя скамарохі, розныя казачныя персанажы, наймілейшыя роставыя лялькі. Святочную атмасферу дапаўнялі народныя прыпеўкі, задзірыстыя мелодыі баяністаў і ўсмешкі ўдзельнікаў. Ярчэй за ўсіх усміхаліся тыя, каму ўдалося займець запаветнага пеўнічка на палачцы або пару абаранкаў. Значную частку забаўляльнай праграмы складалі выступленні этнафолк-калектыву Guda, фальклорныя песні, розныя конкурсы, вясёлыя танцы і дружныя карагоды. Кожны ахвотнік змог паспрабаваць сябе ў змаганнях у армрэстлінгу, дартсе, а таксама ў гонках на мётлах і кіданні кольцаў. Найбольшую ўвагу гасцей свята прыцягнулі намёты з гарачымі залацістымі блінамі. Чарга, вядома, была немаленькая, але ўсе засталіся задаволеныя і, што самае галоўнае, пад'еўшы. Акрамя таго, шмат хто паспеў зрабіць памятныя фота з багінямі вясны і зімы, а таксама з упадабанымі персанажамі Масленіцы.

Уваход на мерапрыемства быў вольны, адзінай умовай з'яўлялася наяўнасць выдатнага настрою. У студэнцкім прафкаме лічаць, што пачынаць трэба з малога, таму Масленіца БДУ – гэта толькі пачатковы этап сярод цікавых, пазнавальных і масавых мерапрыемстваў.

А мы Масленіцу
сустракалі,
Сырам гару набівалі,
Маслам гару налівалі,
На шырокі двор гукалі
Ды блінамі частавалі.

(Песні на гуляннях з вёскі Мадора Рагачоўскага раёна)

Падрыхтавала
Лізавета МАКАРАНКА

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

Скажы СВАЁ слова

Сёлета Міжнародны дзень роднай мовы выпаў на суботу. Таму савет старастаў Інстытута журналістыкі, які кожны год ладзіць свята для студэнтаў, вырашыў крыху змяніць канцэпцыю і расцягнуць імпрэзу на тры дні, каб кожны змог як мага лепш праявіць сябе індывідуальна. Дэвізам стала «Родная мова – скажы СВАЁ слова».

Важным было, каб, знаходзячыся ў астмасферы беларускай культуры два дні, у суботу як мага больш людзей зрабіла свой першы крок да ўсведамлення роднай мовы. З гэтай нагоды студэнты атрымлівалі заданні. Напрыклад, павітацца па-беларуску, набыць штонебудзь у краме на роднай мове ці павіншаваць незнаёмца са святам.

19 і 20 лютага ў Інстытуце журналістыкі праходзілі святочныя мерапрыемствы. Новым у гэтым годзе сталі «Хуткія размовы па-беларуску» – арганізатары ўзялі за аснову прынцып хуткіх спатканняў: размовы па некалькі хвілін, а потым змяняліся суразмоўцы. Галоўным было тое, што людзі, якія саромеюцца размаўляць па-беларуску, прыходзілі пагутарыць з тымі, хто добра валодае роднай мовай. Гэта было неверагодна!

Першы дзень святкавання скончыўся атмасферным паэтычным вечарам.

Пятніца стала яшчэ больш насычанай. Раніцай арганізатары традыцыйна сустракалі ўсіх з песнямі, танцамі і абдымкамі. Пасля такога пачатку дзень не мог не прайсці цудоўна!

Бліжэй да абеду выкладчыкі раскрывалі свае сакрэты па-беларуску. Намеснік дэкана Ганна Курэйчык распавядала пра экзатычныя вандроўкі, а дэкан Сяргей Дубовік падзяліўся ўспамінамі пра вайну ў Афганістане.

Хапала забаў і ў гэты дзень. У беларускамоўны Alias гулялі пары з выкладчыкаў і студэнтаў. Толькі тут можна было пачуць «малайчынка» на правільны адказ выкладчыкаў ад студэнта.

І традыцыйна ўсё завяршылася вечарынай. Гульні і конкурсы, выступленні самых таленавітых студэнтаў, вясёлыя народныя танцы разам са студэнцкім этнаграфічным таварыствам, выступленне гурта Martin S, і самае салодкае напрыканцы: арганізатары частавалі ўсіх дранікамі з квасам і смятанай!

Савет старастаў журфака зрабіў усё магчымае, каб у суботу, у Міжнародны дзень роднай мовы, усе ўпэўнена сказалі сваё слова!

Вікторыя ВІЦЮГОВА
Фота Ганны ЗАНКОВІЧ

Гэты месяц у гісторыі

1 сакавіка 1999 г. (16 гадоў таму назад)
Створаны эканамічны факультэт, а таксама факультэт філасофіі і сацыяльных навук як самастойныя падраздзяленні БДУ.

1 сакавіка 1937 г. (78 гадоў таму назад)
Ва ўніверсітэце навучаюцца 925 студэнтаў, у тым ліку на хімфаку – 187, на біяфаку – 178, на фізмаце – 259, на гістфаку – 140, на геафаку – 161. Многія з іх прыехалі ў сталіцу ўпершыню.

3 сакавіка 1924 г. (91 год таму назад)
Ва ўніверсітэце адкрыты музей гісторыі першабытнай культуры і рэлігіі.

5 сакавіка 1927 г. (88 гадоў таму назад)
Пры медфаку адкрыты першы ў БССР інстытут прыватдацэнтуры.

6 сакавіка 1928 г. (87 гадоў таму назад)
Занесены змены ў правілы прыёму ў БДУ: пры паступленні неабходна здаць іспыт па беларускай мове, а тыя, хто паступае на медфак, павінны мець двухгадовы стаж працы.

7 сакавіка 1960 г. (55 гадоў таму назад)
З нагоды 50-годдзя Міжнароднага жаночага дня 8 Сакавіка Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў ордэнам «Знак пашаны» дацэнта А. П. Ерась і медалём «За працоўную доблесць» дацэнта М. А. Жыдовіч.

9 сакавіка 1929 г. (86 гадоў таму назад)
Фізіка-матэматычная секцыя навуковага таварыства БДУ накіравала віншаванне Альберту Эйнштэйну ў сувязі з яго 50-годдзем. Атрымана падзячная тэлеграма ад юбіляра.

10 сакавіка 1949 г. (66 гадоў таму назад)
На камсамольскім сходзе студэнтаў філалагічнага факультэта з дакладам пра вынікі XVI з'езду ЛКСМБ выступіў сакратар ЦК ЛКСМБ П. М. Машэраў.

11 сакавіка 2004 г. (11 гадоў таму назад)
Створаны гуманітарны факультэт.

12 сакавіка 1954 г. (61 год таму назад)
На асваенне цалінных земляў адправіліся 170 камсамольцаў Мінска, у тым ліку і з БДУ.

13 сакавіка 2003 г. (12 гадоў таму назад)
БДУ наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. Прэзідэнт сустрэўся са студэнтамі і выкладчыкамі ўніверсітэта, адказаў на шматлікія пытанні.

14 сакавіка 2006 г. (9 гадоў таму назад)
Беларускія ўдзельнікі ўсіх экспедыцый у Антарктыду сабраліся на геаграфічным факультэце. Сустрэча з палярнікамі арганізавана Беларускім геаграфічным грамадствам. Характэрна, што беларускія палярнікі бралі ўдзел ва ўсіх экспедыцыях у Антарктыду, пачынаючы з першай антарктычнай экспедыцыі 1956 года.

14 сакавіка 1963 г. (52 гады таму назад)
Камітэт камсамола стварыў штаб працоўных спраў, які заняўся арганізацыяй працы студэнтаў у калгасах і саўгасах Беларусі.

Пра іншыя падзеі чытайце на сайце БДУ ў раздзеле «Пра ўніверсітэт»

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты –
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам
інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082
ад 21 студзеня 2010 года

28 лютага 2015 года
Падпісана да друку 26.02.2015 г.
Зак. ___. Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by